# АБ ВЫНІКАХ ДРУГОГА ТУРА ГАЛАСАВАННЯ ПА ВЫБАРАХ ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ЯКІ АДБЫЎСЯ 28 МАЯ 1995 ГОДА

Паведамленне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў

Разгледзеўшы пратаколы акруговых выбарчых камісій, Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў паведамляе:

У другім туры галасавання выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь праводзіліся ў 216 выбарчых акругах. Агульная колькасць выбаршчыкаў па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у другім туры галасавання склала 6138054. Атрымалі выбарчыя бюлетэні 3474250 выбаршчыкаў. У галасаванні прынялі ўдзел 3471876 выбаршчыкаў, або 56,5 працэнта.

У Брэсцкай вобласці прынялі ўдзел у галасаванні 56,4 працэнта, у Віцебскай – 59,1, у Гомельскай – 61,8, у Гродзенскай – 58,9, у Магілёўскай – 61,6, у Мінскай – 60,4, у горадзе Мінску – 38,4 працэнта выбаршчыкаў.

У большасці выбарчых акруг другі тур галасавання праводзіўся па двух кандыдатах у дэпутаты, якія атрымалі ў першым туры выбараў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў.

У другім туры галасавання выбары адбыліся ў 129 выбарчых акругах. Дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь выбраны ў 101 выбарчай акрузе. У 28 выбарчых акругах выбары адбыліся, але ў акругах дэпутаты не выбраны, таму што ні адзін з іх не набраў неабходнай колькасці галасоў.

У 87 выбарчых акругах выбары не адбыліся.

Па сто сорак адной выбарчай акрузе, дзе ў першым туры выбараў і ў другім туры галасавання дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь не былі выбраны, у адпаведнасці з артыкулам 57 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь” будуць праведзены паўторныя выбары.

Паведамленні аб выніках выбараў па кожнай выбарчай акрузе апублікаваны акруговымі выбарчымі камісіямі ў мясцовым друку.

Спіс зарэгістраваных дэпутатаў публікуецца.

Цэнтральная камісіі Рэспублікі Беларусь<br>па выбарах і правядзенню<br>рэспубліканскіх рэферэндумаў

6 чэрвеня 1995 года